СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 26 (41), 26.10–01.11. 2006 г.

# СТАНКІ ВАЖНЕЙ ЗА ЛЮДЗЕЙ

## Улады не зважаюць на галадоўку пратэстантаў у Мінску, а таксама не заўважаюць галадоўнікаў на бабруйскай "Белшыне"

Пра беларускіх вернікаў-пратэстантаў з царквы "Новае жыццё" ў Мінску напісалі буйныя СМІ практычна ўсяго свету, за выключэннем беларускіх дзяржаўных газет, радыё і БТ. Для іх проста не існуе сотні беларускіх грамадзянаў, якія пайшлі на скрайнюю меру – галадоўку.

Інакш як рабаваннем дзеянні Мінгарвыканкама, які забраў у вернікаў набыты і адрамантаваны імі за ўласныя сродкі будынак былога кароўніка, прапанаваўшы ім 17 тысяч даляраў, назваць нельга. І справа нават не ў тым, што за гэтыя грошы сёння ў Мінску не тое што будынак – стары хлеў на ўскраіне не купіш.

Як здзек прагучалі словы галоўнага ідэолага дзяржавы, намесніка кіраўніка адміністрацыі Лукашэнкі Алега Праляскоўскага, які пры сустрэчы з пастарам "Новага жыцця" параіў пратэстантам-…звярнуцца ў Вышэйшы гаспадарчы суд. (Пры тым, што гарадскі гаспадарчы раней прыняў рашэнне на карысць улады).

Тры тыдні ў Бабруйску трымае галадоўку прафсаюзная актывістка Алена Захожая. Яе патрабаванні простыя – спыніць дыскрымінацыю паводле прафсаюзнай прыналежнасці. Сябры пярвічнай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюза, адрозна ад усіх астатніх работнікаў прадпрыемства "Белшына", не атрымалі ні прэміяльных да Дня хіміка, ні даплаты на аздараўленне. Улады адмаўляюцца рэгістраваць пярвічную арганізацыю незалежнага прафсаюза на «Белшыне». Да галадоўкі далучыліся яшчэ пяцёра сяброў гэтай арганізацыі.

Ніводнае патрабаванне галадоўнікаў не было выкананае. Больш за тое, кіраўніцтва "Белшыны" і канцэрна "Белнафтахім", у які ўваходзіць прадпрыемства, з усіх сіл намагаецца не заўважаць галадоўнікаў. Ім нават не даюць магчымасці патлумачыць прычыны сваёй галадоўкі іншым рабочым.




**Мітынг вернікаў** *пратэстанцкай царквы "Новае жыццё" у абарону сваіх правоў. Мінск, пл. Бангалор, 21 красавіка 2006 году.*

Кіраўнік канцэрна Бароўскі заклапочаны зусім іншай праблемай. Ён публічна разважае аб тым, як добра было б прывезці на завод кіраўніка дзяржавы і паказаць яму, як працуюць… новыя станкі. Станкі, па ўсім відаць, даражэй уладзе, чым тыя, хто на іх працуе.

## ЧЫМ СКОНЧЫЦЦА ГАЗАВЫ ШАНТАЖ?

### АПЫТАННЕ ТЫДНЯ

► СТАР. 2, 4

## ПІСЬМЕННІКІ-КАСМАНАЎТЫ З «ІНВАЛІДСКАЙ КАЛЫСКІ»

### АГЛЯД ДРУКУ І РАДЫЁ

► СТАР.6

# ЧЫМ СКОНЧЫЦЦА ГАЗАВЫ ШАНТАЖ БЕЛАРУСІ З БОКУ МАСКВЫ?

**СТАНІСЛАЎ БАГДАНКЕВІЧ,**
**БЫЛЫ СТАРШЫНЯ НАЦБАНКУ БЕЛАРУСІ, ПРАФЕСАР:**

## "СКОНЧЫЦЦА ПШЫКАМ"

Гэта безумоўна шантаж. Але я думаю, што ён скончыцца пшыкам. Я думаю, што Расія ў чарговы раз пойдзе насустрач Лукашэнку. А Лукашэнка адкупіцца нейкімі саступкамі Расіі. Хутчэй за ўсё, часткай нерухомасці. Можа быць, часткай "Белтрансгаза" і нафтаперапрацоўчых заводаў. Гэтым усё і скончыцца. Я мяркую, што Расія пойдзе на ўзгадненне больш нізкай цаны для Беларусі, у параўнанні з тым, што яна аб'явіла. Расія не пойдзе ні на якія рэзкія крокі. Яна саступіць, як саступала шматкроць. Для яе важна захаваць у Беларусі блізкі да сябе рэжым. Расія сёння аднаўляе свой імперскі імідж, намагаецца падкрэсліць сваю веліч. І для яе важны такі сябра, як Лукашэнка. І ён гэта адчувае. Таму ідзе на абвастрэнне. Так што, я думаю, цэны будуць павышаныя, але ў цалкам прымальным для Беларусі варыянце.

**ВАЛЯНЦІН, СЛУЖБОВЕЦ:**

## "НАС ПРОСТА ПАСТАВЯЦЬ ПЕРАД ФАКТАМ"

Насамрэч гаворка ідзе не пра цану газа. Газ у Расіі нікольні не каштуе. Ён з зямлі прэ. Гаворка ідзе пра "Белтрансгаз". А гэтая інфраструктура для Расіі, канечне, вельмі патрэбная. І сказаць, што тут нас шантажуюць… Нас проста паставяць перад фактам. І будуць дабівацца свайго. Таму тут варыянты могуць быць самыя розныя. Цана 180 даляраў і непрададзены "Белтрансгаз". А можа быць, 140 баксаў, і "Белтрансгаз" прададуць. І скончыцца гэта можа чым заўгодна. Але вынік абумоўлены пазіцыяй моцнага прадаўца і слабога пакупніка, які стаіць на базары і лямантуе.

**ЯРАСЛАЎ БЕРНІКОВІЧ,**
**ПРАДПРЫМАЛЬНІК З ГЛЫБОКАГА:**

## "НІЧОГА СТРАШНАГА ДЛЯ ЛУКАШЭНКІ НЕ АДБУДЗЕЦЦА"

Цяжка сказаць. Я не думаю, што цэны застануцца на ранейшым узроўні. Але дужа высокімі не стануць. Недзе каля сямідзесяці даляраў, я думаю. Нельга вельмі моцна прыціснуць Лукашэнку. Гэта Расіі нявыгадна. Там баяцца лукашэнкавых спробаў павярнуцца на Захад.

**ПАВЕЛ ДАНЭЙКА, ЭКАНАМІСТ:**

## "БЕЛАРУСКАЯ ЭКАНОМІКА ВЫТРЫМАЕ"

Гэта ніякі не шантаж. Людзі зарабляюць грошы сваім шляхам. І іх не цікавяць палітычныя наступствы гэтага працэсу – кшталту аб'яднання Беларусі і Расіі. Калі яны змогуць зарабіць свае грошы без аб'яднання, яны будуць задаволеныя. Калі трэба будзе аб'яднаць Беларусь з Расіяй, каб зарабіць свае грошы, яны будуць аб'ядноўваць. Іх не цікавіць ідэалогія, іх цікавяць грошы. На сённяшні момант сітуацыя з ідэалогіяй памянялася. Грошы сталі даражэйшыя за ідэалогію. Ідэалогія зараз абслугоўвае зараблянне грошай. І гэта вялікая змена ў Расіі. І гэта для нас "плюс". Таму што з людзьмі, якія зарабляюць грошы, можна нешта абмяркоўваць. З людзьмі, якія кіруюцца ідэалогіяй, нічога абмяркоўваць немагчыма. З Расіяй можна пачынаць гандлявацца. Цяжка, дзіка, але ёсць падставы для гандлю. Беларуская эканоміка вытрымае трохразовае падвышэнне цэнаў на газ.

**ГЕОРГІ, СТУДЭНТ:**

## "НІЧЫМ ГЭТЫ НАЕЗД НЕ СКОНЧЫЦЦА"

Абломяцца маскалі ў чарговы раз. У выніку іх "разумнай" знешняй палітыкі ўжо не толькі гарачы джыгіт Саакашвілі іх пасылае, але ўжо нават наш кіраўнік хвост падняў. Апошні лепшы сябра Масквы і той мае, што сказаць ёй непрыемнае. Таму нічым не скончыцца. Як "бацька" скажа, так і будзе.

**КАНСТАНЦІН, МЕНЕДЖЭР:**

## "КІРАЎНІЦТВУ ПАРА ДУМАЦЬ ПРА РАТАВАННЕ ЗАДНІЦЫ"

Гэта нельга назваць шантажом. Таму што газ сапраўды каштуе 200 баксаў. Па-другое, гэта не зусім шчыра, калі кажуць пра спрэчку гаспадарчых суб'ектаў. З боку Расіі прымешваецца ў тым ліку і палітыка, як гэта было з Украінай. З боку "бацькі" гэта загадзя пройгрышная пазіцыя. Таму што пагрозы, якіх ты не можаш ажыццявіць, вельмі недарэчна выказваць. Яму трэба браць бел-чырвона-белы сцяг і сігналізаваць ім Захаду. Але гэта трэба было рабіць пазаўчора. Сёння пара думаць пра ратаванне задніцы.

**ЯРАСЛАЎ РАМАНЧУК, ЭКАНАМІСТ:**

## "ГЭТА МОЖА СПРЫЧЫНІЦЦА ДА КРЫЗІСУ"

Я б не назваў гэта шантажом. Гэта пераход на рынкавыя ўмовы. І я думаю, скончыцца ён тым, што Беларусь урэшце будзе мець мінімальную цану – 150 даляраў за тысячу кубаметраў газа. І праз два-тры гады, калі цэны стануць рынкавымі ўнутры Расіі, у нас будуць нармальныя рынкавыя стусункі, як паміж дзвюма незалежнымі дзяржавамі. Вось, калі новыя цэны на газ будуць сумешчаныя з нафтай і гандлёвым пратэкцыянізмам, тады сітуацыя будзе зусім іншая. Тады мы напрыканцы 2007-га году сутыкнемся з вельмі сур'ёзнымі наступствамі. Гэта можа спрычыніцца да інфляцыі, да дэвальвацыі курсу беларускага рубля. І, безумоўна, нашыя пенсіі, заробкі ў рублях стануць каштаваць менш. І гэта прывядзе да таго, што людзі пачнуць забіраць свае грошы з банкаў. Тады настане банкаўскі крызіс, які стане тым каталізатарам, што прывядзе да іншай эканамічнай палітыкі. І ў выніку – да іншай палітычнай сітуацыі.

**ІРЫНА, БУХГАЛТАРКА:**

## "НЕЭФЕКТЫЎНАЙ ЭКАНОМІЦЫ ПРЫЙДЗЕ КАНЕЦ"

Калі мы пяройдзем на рынкавыя адносіны, у нас будзе электраэнергія па еўрапейскіх цэнах, газ па еўрапейскіх цэнах, нават заробкі, як у Еўропе, па 2000 еўра. З прычыны жудаснай неэфектыўнасці сённяшняй беларускай эканомікі, ёй прыйдзе канец. Вось і ўсё.

# ЕС ПАШЫРАЕ СПІС НЕЎЯЗНЫХ БЕЛАРУСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ

Рада Еўрасаюза вырашыла пашырыць спіс беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю ЕС. Раней у гэты спіс уваходзілі шэсць чалавек – у тым ліку Аляксандр Лукашэнка, міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, былы кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Віктар Шэйман, былы кіраўнік МУС Юры Сівакоў, камандзір брыгады спецназа Дзмітрый Паўлічэнка, старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына і начальнік мінскага АМАП Юры Падабед. Сёлета ў красавіку спіс быў пашыраны да 37 чалавек за кошт асобаў, адказных за парушэнні правоў чалавека падчас выбарчай прэзідэнцкай кампаніі. Цяпер спіс неўязных дапоўнены імёнамі яшчэ чатырох асобаў. Гэта суддзя Маскоўскага раёна Мінска Аляксей Рыбакоў і дзяржаўны абвінаваўца Сяргей Бортнік — за прысуд Аляксандру Казуліну, а таксама суддзя Цэнтральнага суда Мінска Леанід Ясіновіч і дзяржаўны абвінаваўца Андрэй Мігун — за прысуд актывістам незарэгістраванай арганізацыі «Партнёрства».

Тым часам лідэр аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі Аляксандр Мілінкевіч накіраваў зварот да кіраўнікоў парламентаў краін Еўрасаюза, ЗША, Расіі і Украіны з заклікам запатрабаваць ад уладаў Беларусі спыніць рэпрэсіі і вызваліць усіх палітвязняў. Сярод іх Мілінкевіч назваў маладафронтаўцаў Змітра Дашкевіча, суд над якім пачнецца 30 кастрычніка і Паўла Красоўскага, супраць якога былі вылучаныя абсурдныя абвінавачанні ў тэрарызме і гвалтаваннях. "Улады былі вымушаныя яго адпусціць. Але крымінальны пераслед не спынены", — адзначаецца ў звароце.

Аляксандр Мілінкевіч нагадвае, што "падчас выбарчай кампаніі тысячы людзей былі арыштаваныя. Сёння больш за 10 чалавек за палітычную дзейнасць пазбаўленыя волі і знаходзяцца за кратамі. Сярод іх экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, палітыкі Мікола Статкевіч, Андрэй Клімаў, маладзёвыя лідэры Павел Севярынец, Артур Фінкевіч".

**Паводле БелаПАН і Радыё Свабода.**

# «УРОКІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

*23 кастрычніка ў Мінску адбыўся прагляд фільма польскага рэжысёра Міраслава Дэмбіньскага «Урокі беларускай мовы. Моладзь супраць Лукашэнкі».*

На праглядзе прысутнічалі журналісты. Прэзентацыя для шырокай грамады адбудзецца праз некалькі тыдняў.

Фільм польскага рэжысёра прысвечаны падзеям у Беларусі падчас апошняй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. У фільме расказваецца пра жыццё вучняў гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа. Аповед вядзецца ад імя Франка Вячоркі, былога ліцэіста.




Міраслаў Дэмбіньскі вядомы еўрапэйскім гледачам, апрача ўсяго, сваёй стужкай пра Аранжавую рэвалюцыю ва Украіне. Сакавіцкія падзеі ў Мінску ён здымаў па частках: на Дзень Волі здолелі трапіць толькі два супрацоўнікі здымачнай групы, рэжысёра не прапусцілі праз мяжу і яму давялося кіраваць здымкамі цераз інтэрнэт. Дарэчы, на прэзентацыю фільма ў Мінск Дэмбіньскі таксама не змог прыехаць – яго зноў не ўпусцілі ў краіну беларускія памежнікі.

**Паводле www.nn.by**

# ШЭСЦЕ НА ДЗЯДЫ ПРОЙДЗЕ 29 КАСТРЫЧНІКА

Мінскі гарвыканкам і Мінскі аблвыканкам дазволілі правесці 29 кастрычніка мемарыяльны мітынг і шэсце, прысвечаныя Дзядам – дню памяці продкаў. Заяўка на правядзенне акцыяў была накіраваная Кансерватыўна-хрысціянскай партыяй БНФ (КХП-БНФ).

29 кастрычніка ў 10.30 плануецца збор удзельнікаў на пляцоўцы на бульвары Талбухіна каля станцыі метро "Парк Чалюскінцаў". З 11.30 да 14.30 пройдзе шэсце па праспекце Незалежнасці, вуліцах Каліноўскага, Сядых, Карбышава, Гамарніка і Мірашнічэнкі да кальцавой дарогі. З 14.30 да 17.00 адбудзецца мемарыяльны мітынг ва ўрочышчы Курапаты, на месцы масавых расстрэлаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў.

**Паводле БелаПАН**

## Суседзі

# БЕЛАРУСЬ 151-АЯ

Аб гэтым гаворыцца ў дакладзе міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» (Reporters sans frontieres) за 2006 год.

Апошняе, 168-е месца ў рэйтынгу займае Паўночная Карэя. Перадапошняе – Туркменістан. Беларусь апярэдзілі такія краіны як Гамбія і Емен, а за ёй следам ідуць Лівія, Сірыя і Ірак, дзе працягваецца вайна.

Самую высокую пазіцыю сярод суседзяў Беларусі займае Латвія. Яна дзеліць 10-13-е месцы з Венгрыяй, Партугаліяй і Славеніяй. Літва займае 26/27-е месцы ў рэйтынгу разам з Велікабрытаніяй.

Польшча апынулася на 58-месцы – гэта самы нізкі вынік сярод краінаў Еўрасаюза. (Прычынаю стала ўмяшальніцтва дзяржавы ў справы тых медыяў, якія крытыкуюць прэзідэнта і прэм'ера Польшчы братоў Качыньскіх).

Украіна дзеліць 105-106 месцы на пару з Індыяй. (Кітай заняў шостае месца знізу).

Расія займае 147-е месца ў спісе. Яна зусім не нашмат апярэдзіла Беларусь. Як паведамляецца ў дакладзе, у Расіі адбываецца пакупка незалежных СМІ людзьмі, блізкімі да прэзідэнта Пуціна, застаюцца нераскрытымі забойствы журналістаў – рэдактара часопіса Forbes Пола Хлебнікава і аглядальніцы «Новой газеты» Ганны Паліткоўскай.

Першыя чатыры месцы ў рэйтынгу свабоды прэсы дзеляць Фінляндыя, Ірландыя, Іспанія і Нідэрланды, дзе не зафіксавана ніводнага выпадку цэнзуры альбо пагрозы журналістам.

ЗША страцілі 36 пазіцыяў у параўнанні з 2002 годам і апынуліся на 53-м месцы ў сувязі з наданнем федэральным судам паўнамоцтваў патрабаваць у СМІ раскрыцця крыніц інфармацыі.

**Паводле www.rsf.org**

# БЕЛАРУСІ ДАВЯДЗЕЦЦА КУПЛЯЦЬ ГАЗ ПА 100 ДАЛЯРАЎ І ВЫШЭЙ

## АЛЕ МЫ ЎЖО ЦЯПЕР ПЛАЦІМ ЗА ЯГО ДЗЯРЖАВЕ АМАЛЬ СТОЛЬКІ Ж!

Колькі сіл страцілі беларускія і расійскія афіцыйныя СМІ на тое, каб давесці, што ўкраінцы пасля "аранжавай рэвалюцыі" жывуць у жабрацкіх, нечалавечых умовах. І ніхто з дзяржаўных журналістаў не падумаў, зразумела, паведаміць, што шкадаваць, найперш, трэба саміх сябе, а не ўкраінцаў.

Калі ў Беларусі апошні раз зніжаліся цэны? Ну, хоць на нешта…Цяжка згадаць? І я, на жаль, не памятаю. Зусім наадварот – кожны месяц цэны патроху, але няўхільна паўзуць угору. А ўжо аб зніжэнні цэнаў на энерганосьбіты, камунальныя плацяжы ніхто ў Беларусі даўно і не марыць. Тым больш, зараз, калі беларускі ўрад нервова чакае вынікаў перамоваў з Расіяй наконт цаны на газ у 2007-м годзе.

Вельмі цікавым і павучальным для нашых чыноўнікаў мог бы стаць досвед іх украінскіх калегаў. Напрыклад, пастанова ўраду Украіны, паводле якой сёлета з 1-га лістапада цэны на газ для насельніцтва скарачаюцца з 82 даляраў за тысячу кубаметраў да 67.

І гэта ў "жабрацкай Украіне", якая, заўважце, адлучаная ад расійскай газавай халявы ўжо даўно і ад пачатку 2006-га году плаціць за газ паводле рынкавых цэнаў – 95 даляраў за тысячу "кубоў". Гэта цана, якой "Газпром" яшчэ толькі палохае Беларусь.

Такім чынам, купляючы газ у Расіі за 95 даляраў, украінскі ўрад знаходзіць магчымасць прадаваць яго сваім грамадзянам за 67.

Зусім іншая сітуацыя ў Беларусі: як вядома, наша краіна плаціць Расіі за тысячу кубаметраў газу крыху больш за 46 з паловай даляраў. А грамадзянам Беларусі ўрад прадае яго па 93 даляры. Дарэчы, гэтулькі ж, фактычна, паводле двайнога тарыфу, за газ плацяць дзяржаве і беларускія прадпрыемствы.

Улады тлумачаць гэты феномен загадкава. Лукашэнка, у прыватнасці, выказаўся пра гэта наступным чынам: «Мы сёння купляем газ па 46,68 даляраў. На мяжы. Пакуль да пастаўнікоў даставім, у нас ужо прамысловыя прадпрыемствы спажываюць газ па 80-90 даляраў».

Цікава атрымліваецца: для таго, каб паставіць газ з Ямала, які значна далей ад Масквы, чым мяжа Беларусі, расійцам хапае 46 даляраў. З улікам выдаткаў на транспартаванне і прыбыткаў «Газпрома», і ўсіх іншых неабходных плацяжоў у выглядзе выплаты заробкаў і падаткаў. У нас жа жыхары і прадпрыемствы Воршы, напрыклад, якая ўсяго ў некалькіх дзясятках кіламетраў ад мяжы з Расіяй, плацяць паводле двайнога тарыфу.

Забаўна на гэтым фоне гучаць абвінавачанні на адрас Расіі ў тым, што яна плюе на дружбу народаў і саюзніцкія адносіны і шантажуе Беларусь газавым вентылем.

Аб прыбытку, які атрымлівае дзяржава ад такога своеасаблівага газавага бізнесу за кошт уласных грамадзянаў, нічога не вядома. Як мяркуюць аналітыкі, малая частка прыбытку ідзе на пагашэнне старой запазычанасці перад «Газпромам» і аплату бягучай запазычанасці бюджэтных арганізацыяў за спажытыя энергарэсурсы. А куды ідуць астатня 70-80% прыбыткаў, атрыманых дзяржавай, не ведае ніхто.

Так што ў выніку падвышэнне цэнаў на расійскі прыродны газ можа ніяк не адбіцца на звычайных беларусах. Бо, хоць і існуюць больш песімістычныя прагнозы, аналітыкі, спасылаючыся на прагноз Міністэрства эканамічнага развіцця і гандлю Расіі, схіляюцца да думкі, што цана на газ для Беларусі ў 2007 годзе вырасце да 100 даляраў за тысячу кубаметраў. Але ж мы і сёння плацім амаль столькі ж!

Праўда, падаражэнне не адаб'ецца на жыхарах Беларусі толькі ў тым выпадку, калі ўлады РБ адмовяцца ад свайго газавага бізнесу. Калі ж яны надалей будуць прадаваць газ сваім грамадзянам з падвойнай "накруткай", дык выніковая цана для спажыўцоў складзе ўжо каля 200 даляраў. І гэта будзе вельмі адчувальны для ўсіх рост.

А "ўкраінскі цуд" у Беларусі яўна не паўторыцца. Гэта ўкраінскія ўлады знаходзяць магчымасць зменшыць ціск пераходнага перыяду на жыхароў сваёй краіны, кампенсуючы цэны на газ за кошт іншых крыніц даходу. Улады РБ, выглядае, цікавяць толькі іх уласныя даходы.

**Алег Ман**

# "БРАТЭРСКІЯ АДНОСІНЫ ВЫПАДАЮЦЬ З КАНТЭКСТУ"

## МАСКОЎСКІЯ ЭКСПЕРТЫ ПРА БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІЯ ДАЧЫНЕННІ

**Аляксандр Шохін, прэзідэнт Расійскага саюзу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў**:

"У канструкцыі «саюзнай дзяржавы» адсутнічаюць важнейшыя элементы – адзіны эмісійны цэнтр, адзіная гандлёва-мытная палітыка. Таму расійскія ўлады ўсвядомілі, што "нельга быць крыху цяжарнай". Паколькі стварыць адзіную валюту не ўдаецца, Расія спрабуе пабудаваць адносіны з беларускімі гаспадарчымі структурамі на больш універсальных прынцыпах, уласцівых адносінам унутры ЕўрАзЭС ці СНД. Цягам 10 гадоў адносіны з Беларуссю былі больш "прасунутымі", больш спрыяльнымі, чым з тым самым Казахстанам. Але Казхастан дзейнічае паводле прынцыпаў, больш характэрных для Еўрасаюза, а Беларусь будуе інтэграцыю паводле схемы "альбо любоў да скону, альбо поўнае ахаладжэнне". Ахаладжэнне ў расійска-беларускіх адносінах сапраўды ёсць, але гэта азначае ўсяго толькі ператтварэнне Беларусі ў такога самага нармальнага партнёра па інтэграцыі, якім з'яўляецца Казахстан".

**Аляксей Малашэнка, вядучы навуковы супрацоўнік Маскоўскага цэнтра Карнэгі:**

"Перш за ўсё, ад Лукашэнкі Расіі няма ніякай карысці. Ён хоць і клянуся ў любові, але рэальна ад яго нічога няма. Па-другое: апошнім часам ён сябе пазіцыянуе не як брат Расіі, а як нацыянальны прэзідэнт, які можа зрабіць адскокі ў самыя розныя бакі. Ён, проста кажучы, надакучыў Расіі. І тое, што ён не карыстаецца папулярнасцю ў расійскім істэблішменце, у тым ліку ў Пуціна, у прынцыпе, досыць вядома. І апошняе, але таксама вельмі важнае: усё-ткі Расія паступова пераводзіць свае адносіны з дзяржавамі СНД на камерцыйную аснову. І братэрскія адносіны з гэтага кантэксту выпадаюць".

**Паводле www.ng.ru**

# ПРА МАЛОЙЦАЎ-КАМСАМОЛЬЦАЎ І “ПІРАМІДУ”

*Дзяржаўныя маладзёвыя арганізацыі чакае чарговая рэформа. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў стварыць адну буйную структуру, якая мусіць аб'яднаць і піянераў, і сучасных камсамольцаў (БРСМ) і ўсіх астатніх.*




Боевые отряды БРСМ - надежда нации!

www.belzhaba.com

Да рэарганізацыяў у гэтай галіне ўжо ўсе прызвычаіліся. Спробы стварыць маладзёвыя структуры, якія б эфектыўна падтрымлівалі палітыку кіраўніка дзяржавы, пачаліся яшчэ ў мінулым стагоддзі. Першай такой ініцыятывай стала “Прямое действие”. Менавіта з яе шэрагаў выйшаў Усевалад Янчэўскі, які потым некалькі год ачольваў новастворны Беларускі патрыятычны саюз моладзі. Неўзабаве ўлады вырашылі аб'яднаць БПСМ з Беларускім саюзам моладзі. Новая арганізацыя займела назву Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ). І вось цяпер да яе імкнуцца далучыць яшчэ і піянераў разам з Беларускім камітэтам маладзёвых арганізацый.

Падобна, што ў Лукашэнкі ўжо не хапае грошай, каб утрымліваць такую колькасць дармаедаў. Пра гэта ён адкрыта заявіў падчас сустрэчы з кіраўнікамі маладзёвых арганізацый: “Ніводная галіна беларускага грамадства не атрымала такой каласальнай падтрымкі...”

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтыя структуры ўжо імкнуцца самі зарабляць грошы. Праўда, напярэдадні нарады першы сакратар Мінскага гаркама БРСМ Сяргей Чыграй прызнаў, што складак ад сябраў арганізацыі хапае толькі на кветкі ветэранам. А вялізны апарат “лукамольцаў” утрымлівае дзяржава за кошт нашых з вамі падаткаў.

З неабходнасцю выхаду на самафінансаванне згадзіўся (а куды падзенешся!) першы сакратар ЦК БРСМ Леанід Кавалёў. «Гэта не толькі эканамічнае, але і палітычнае пытанне, але мы знаходзімся толькі на старце», -- сціпла заўважыў ён. І адклаў гэтую перспектыву ажно да 2010 году.

Праўда, шэраг структураў, створаных пад дахам БРСМ, усё-ткі здолелі вызначыцца. Некаторыя, набраўшы грошай пад будаўніцтва жылля, гадамі адмаўляюцца выконваць свае абавязкі перад дольшчыкамі. А ўлетку разгарэўся скандал, звязаны з парушэннем прэзідэнцкага дэкрэта пра гандаль людзьмі. Бээрэсэмаўцы накіравалі беларускіх дзяўчат на працу на поўдзень, дзе іх фактычна выкарыстоўвалі ў якасці рабыняў. Міліцыя вымушаная была скласці з гэтай нагоды пратакол. Але “справу БРСМ” у судзе “замялі”.

Цяпер з'явілася іншая ідэя: зарабляць грошы праз латарэю. Натуральна, што пад гэтую справу “камсамольцы” патрабуюць ад дзяржавы чарговых ільготаў. У прынцыпе, лагічным працягам будзе адкрыццё пад эгідай БРСМ публічных дамоў. Калі маладзёвы саюз здолее стварыць агульнанацыянальную сетку прастытутак, то сапраўды можа разлічваць на самафінансаванне.

Аднак, больш верагодныя іншыя сцэнары. Калі Лукашэнка будзе заставацца ва ўладзе, то БРСМ, спасылаючыся на цяжкое дзяцінства і адданасць кіраўніку дзяржавы, будзе цягнуць з яго грошы і пасля 2010 году. Калі ж улада зменіцца, БРСМ сканае ў адзін момант. Бо па сутнасці гэтая арганізацыя – фінансава-палітычная піраміда.

Між іншым, Лукашэнка разумее, што яго падманваюць. Аднак паколькі на сапраўднае каханне ён разлічваць не можа, то вымушаны трымаць хаця б тых, хто пагаджаецца на любоў за грошы. Тым больш, што бярэ ён іх не з уласнай кішэні.

**Віктар Філін**

# САМІТ СНД ПЕРАНОСІЦЦА З МІНСКА Ў АЛМАТЫ?

## ЛІДЭР КАЗАХСТАНА ПЕРАХОПЛІВАЕ ІНІЦЫЯТЫВУ Ў СВАЙГО БЕЛАРУСКАГА КАЛЕГІ

Тэма пераносу саміту кіраўнікоў краінаў СНД развіваецца паводле законаў вострасюжэтнага фільма. Мала таго, што перанесены тэрмін –з 16-17-га кастрычніка на 28 лістапада (папярэдне), дык яшчэ і месца правядзення сустрэчы апынулася пад пытаннем.

Паводле расійскай газеты «Время новостей», кіраўнікам дзяржаваў Садружнасці могуць прапанаваць сабрацца не ў Мінску, як гэта запланавана, а ў былой сталіцы Казахстана Алматы, дзе 15 гадоў таму было абвешчана стварэнне міждзяржаўнай арганізацыі былых рэспублік СССР.

«З фармальнага гледзішча у сп. Назарбаева ёсць яшчэ некалькі аргументаў, каб настойваць на сваёй прапанове (пераносу чарговага саміта ў Алматы – рэд.), – піша «ВН». — Па-першае, ён зараз старшынюе ў Садружнасці незалежных дзяржаваў. Па-другое, менавіта яму было даручана падрыхтаваць прапановы аб “ратаванні” СНД, распрацаваць захады, скіраваныя на падвышэнне яго эфектыўнасці. І нарэшце, па-трэцяе, Нурсултан Назарбаеў, як і прэзідэнты Узбекістана Іслам Карымаў і Туркменістана Сапармурат Ніязаў, застаюцца апошнімі кіраўнікамі, якія застаюцца ва ўладзе ў сваіх краінах цягам апошніх 15 гадоў пасля распаду СССР. Назарбаева – хто з павагай, а хто і з доляй сарказму – называлі ўсе гэтыя гады галоўным “інтэгратарам” на постсавецкай прасторы.»

www.gazetaby.com

**Ад рэдакцыі:** Што да імкнення Назарбаева, нібыта, максімальна інтэгравацца з Масквой, дык варта звярнуць увагу на даволі нечаканы факт. Днямі прэзідэнт Казахстана прапанаваў навукоўцам падумаць над тым, як у сціслыя тэрміны перавесці казахскую мову з кірылічнага пісьма на “лацінку”. Гэта азначае, што ўслед за іншымі былымі савецкімі рэспублікамі Сярэдняй Азіі Казахстан у сваім культурніцка-гістарычным развіцці ўсё больш арыентуецца не столькі на Маскву, колькі на інтэграванне ў сусветную супольнасць і адначасова – шукае свой адметны нацыянальны шлях.

"Саюздрук"

# ПІСЬМЕННІКІ КНЫШ І КАВАЛЁНАК

## АЛЬБО "СВОЙ СВОЕГО НЕ ПОЗНАША"

Добрую навіну прынесла ў аўторак газета "Советская Белоруссия". Памятаеце дыскусіі пачатку 1990-х на тэму "ці паболее ад роднай мовы каўбасы?" Беларускія кандытары, падобна на тое, ужо ведаюць дакладны адказ на гэтае пытанне. Больш, чым у пяць разоў скарочаныя пастаўкі мінскіх і гомельскіх цукерак у Расію. Дэ-юрэ – з прычыны іх назваў, дэ-факта – з-за іх назваў на рускай мове.

*"Российские «Объединенные кондитеры» вместо того, чтобы вернуться к добротной, традиционной рецептуре, повысить качество, поумерить аппетит на извлечение сверхприбыли, они послали в бой армию юристов. Те нашли гениально-примитивный выход. Как известно, «Барбарис», «Дюшес» и т.д. и т.п. во времена Советского Союза выпускались кондитерскими фабриками от Львова до Владивостока. Кто сейчас вспомнит автора названия, или, как ныне говорят, брэнда, популярнейшей конфеты «Мишка на Севере»? Возможно, ее придумали на московской фабрике им. Бабаева, а, возможно, на гомельском «Спартаке»? Кто сейчас это может доказать, когда лет 80 все кондитерские фабрики работали по одним стандартам и по одной рецептуре? Это все равно как если бы кто–нибудь сегодня сказал, что «я придумал слово «Волга» и потому имею приоритет на это название». Так и с конфетами. В хорошем темпе запатентовав наименование «Мишка на Севере», «Барбарис» и т.д., «Объединенные кондитеры» объявили, что белорусы отныне не имеют права использовать эти названия. Это был настоящий удар ниже пояса! Не имея ни морального, ни, по сути, юридического права на подобные деяния, «Объединенные кондитеры» зажгли перед белорусскими коллегами красный свет".*

Не разумею, чаму ж расійскія кандытары не маюць маральнага права? Гэта іх родны брэнд. Прыдуманы на іх роднай мове. Апеты ў шматлікіх дзіцячых вершыках іх роднай літаратуры. Хочацца спадзявацца, што расійскія юрысты не абмяжуюцца адно толькі цукеркамі. Каб ясна даць зразумець жыхарам нашай "самай рускаязычнай рэспублікі", што нельга браць чужое.

Набірае абароты істэрыя ў афіцыйных СМі, выкліканая законным жаданнем "Газпрома" прадаваць свой тавар за рэальную цану. Цытата з "Советской Белоруссии".

*"Начало большому недоразумению положил «Газпром» еще в начале года, заявив о намерении повысить для Беларуси цену на газ до европейского уровня. Цифры в своей величине назывались столь абсурдные, что и повторять их лишний раз не хочется. Главному союзнику предлагали топливо по цене более высокой, чем, скажем, Германии. Или Грузии, с которой Россия, кстати, находится чуть ли не в состоянии «холодной войны»... И тем не менее факт остается фактом: «Газпром» действовал по известному принципу: «бей своих, чтоб чужие боялись!..»*

Я ніяк не магу зразумець, "свои" – гэта што, юрыдычна-гаспадарчы тэрмін? І чым гэтыя "свои" выгадна адрозніваюцца ад "несвоих"? Калі толькі тым, што гатовыя нахаляву браць рэсурсы, узамен прапануючы словы "прызнацельнасці", дык на чорта яны такія здаліся? Разам са сваімі цукеркамі і трактарамі.

А ў белтаўскай газеце "7 дней" першы сакратар прыдворнага СПБ Анатоль Аўруцін расхвальвае выгоды і дасягненні сваёй арганізацыі. Вось пара цытатаў:

*"Организация, которая собралась, чтобы работать, а не митинговать, превращая литературу в политиканство, уверенно становилась на ноги. Хотя год был непростым. Гвалта в оппозиционных средствах массовой информации было много ... О чем, собственно, был крик? Мол, все «вядомыя» литературные имена у них, а тут собрались малоизвестные люди... Это откровенная неправда. В СПБ состоят 18 лауреатов государственных премий, лауреаты многих других премий, академики, профессора... Космонавт Владимир Коваленок пришел к нам, но не потому, что он космонавт, а потому, что написал четыре очень хороших книги. Ренальд Кныш, наставник Ольги Корбут и многих других чемпионов, автор нескольких книжек стихов, также стал членом нашего Союза".*

Тое, што ў лукашэнкаўскім Саюзе сабралася столькі касманаўтаў, не можа не ўразіць. У школьных праграмах Аўруцін хоча замяніць Законнікава сабою, а Быкава – Чаргінцом. Ідэя, безумоўна, цікавая. Прычым, яе трэба ажыццяўляць як мага хутчэй. Бо дзякуючы толькі такому кроку, у гэтых "писателей" застаецца шанец пакінуць хоць які-небудзь след у у гісторыі літаратуры. Але, баюся, не паспеюць.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ЛЯЧЫЦЦА І ВУЧЫЦЦА

## АЛЬБО "ІНВАЛІДСКІЯ КАЛЫСКІ" З "ПЕРСІКАВЫМ ГУСТАМ"

У нядзелю на Радыё Свабода адбылася нарэшце дыскусія паміж Аляксандрам Мілінкевічам і Анатолем Лябедзькам. Доўга я чакаў гэтай дыскусіі і цяпер мушу выказаць свае ўражанні. На жаль, яны невясёлыя. Як быццам спадары Лябедзька і Мілінкевіч не чуюць адзін аднога. Вядоўца задае ім пытанні, яны адказваюць вядоўцу, а на выказванні адзін аднаго ніяк не рэагуюць. Яны ні разу не задалі пытання адзін аднаму, не пракаментавалі ніводнага аргумента суразмоўцы. У выніку ў канцы перадачы кожны застаўся пры сваім меркаванні, поўны гонару, што адстаяў сваю пазіцыю. Можа я ідэаліст, але хай бы напачатку такіх дыскусій кожны з дыскутантаў даваў прысягу, што гатовы пачуць аргументы суперніка і памяняць свае погляды і свае ўчынкі.

На Еўрапейскім Радыё сярод усялякага смецця пра паленне кальяну, кліпаў гурта "Віягра" і перамогу "барацьбітоў" сумо, нарэшце пачуў хоць адну сэнсоўную навіну. У сядзібе БНФ пачаліся моўныя семінары. Выкладаюць сам старшыня БНФ Вінцук Вячорка і спадары Пётра Садоўскі і Зміцер Саўка. Збіраецца слухачоў 50-60. І гэтыя сустрэчы ладзяцца на ўзор колішніх сустрэч "Майстроўні" і "Талакі" ў застойныя савецкія гады. Застаецца толькі павіншаваць народны фронт, што ён нарэшце заняўся той справай, дзе можа атрымаць адназначную перамогу. Жартавалі раней, што ў Савецкім Саюзе добра толькі лячыцца і вучыцца. Відаць, гэты прынцып падыйдзе і для цяперашняй Беларусі. Калі няма магчымасці нармальна займацца палітыкай, дык тады можна вучыцца. А дачакацца б нам і беларускага радыёўніверсітэту.

Прыслухоўваюся я да аднаго журналіста – Мікалая Карнейчука на Еўрапейскім Радыё. Здаецца, і голас сімпатычны, радыйны, і мазгі на месцы – чэмпіён Беларусі ў інтэлектуальных гульнях, лаўрэат прэміі імя Караткевіча. Але ўжывае многія беларускія словы зусім недарэчна, да канца не разумеючы іх сэнсу. Напрыклад, гаворыць пра напой "з персікавым густам" альбо пра "інвалідскія калыскі". Хацелася б чэмпіёну задаць пытаньне: а якія ж дарэчныя адпаведнікі гэтых словаў?

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# КАЛАМУТНЫЯ ГЛЫБІНІ

## “З САБАКАМІ НА ВАЎКОЎ НЕ ХАДЗІ”

Дзядулю Канта агаломшвала зорнае неба над галавой і маральны імператыў у самім чалавеку. Дажыві ён да нашых часоў, мабыць, яго ўвяла б у роспач зусім іншая з’ява.

Калі “Архіпелаг ГУЛАГ” можна было не прачытаць, а толькі пачуць асобныя раздзелы па радыё праз свіст “глушылак”, — запомнілася: у дыктара, які чытаў пра тое, як людзей, толькі што вызваленых з нямецкіх канцлагераў везлі ў новыя лагеры – савецкія, перахапіла голас і нейкі момант ён змагаўся з камяком у горле. І гэта не было “гульнёй на публіку”.

Сёння пра сталіншчыну, пра камунізм і бальшавізм вядома, здаецца, усё. Для тых, хто хоча ведаць. І так, як зорнае неба, маштаб гэтай бяды амаль касмічны. Хоць тварылі яе зусім не іншапланетнікі, а свае, ці – “свае”. Сусед даносіў на суседа, сусед адбіраў у суседа апошняе дабро ў “калхоз”. (Нельга казаць “калгас” – ніколі не чуў, каб у вёсцы хто так казаў. Хай навекі гэта будзе КАЛ і ХОЗ. На мове радзімы гэтага тэрміну.)

Бадай няма ніводнай сям’і, не закранутай так ці інакш чырвонай пошасцю. Нават калі гэта былі самі чэкісты-камуністы. І што? Ледзь не на кожным кроку можна сустрэць асобніка, які бухціць: “Сталіна нада! Пры Сталіне парадак быў!” Вядомы праваслаўны дзяяч Война-Ясянецкі, сам пацярпелы ад рэпрэсій, дык і той пісаў, што кланяецца “марксісту Сталіну” ў пояс, бо той, бач, “державу сохранил”. “Русский народ гордится Сталиным” – сцвярджае вядомы філосаф-“еўразіец” Аляксандр Дугін. А славутая муляжная “лінія Сталіна”?..

Які Кант здолее растлумачыць, чаму імкненне да рабства і подласці не слабейшае, чым да свабоды й святла? Які прарок, які прапаведнік можа дастукацца да заплеснелых нявольніцкіх сэрцаў, калі гэтага не здолелі зрабіць ні Салжаніцын, ні Шаламаў або Быкаў? Што там, на дне гэтых каламутных душаў?

Не магу – і не дужа хачу – запомніць, каторая там КПБ, а каторая ПКБ. Для мяне істотна, што абедзьве партыі з гонарам носяць назву “камуністычная”.

Бываюць добрыя – як асобныя людзі – камуністы. Не бывае добрых камуністычных партый.

Вось бы так пры чарцы спытаць спадара Калякіна – чаго ты, як п’яны плоту, трымаешся гэтай назвы? Хто табе з тых правадыроў такі мілы – Ленін? Сталін? Троцкі або Дзяржынскі? Што табе дарага, што ты хочаш захаваць з прасмярдзелай крывёю, калам і страхам гісторыі ВКП(б)-КПСС?

Не скажа. Бо па “Свабодзе” назваў сталінскі перыяд – “перагібамі”.

І апазіцыя не брыдзіцца такіх паплечнікаў. Вораг майго ворага – мой сябра, ці не так? Абы нас было найболей, а якіх – неістотна?

“З сабакамі на ваўкоў не хадзі” – гаварыў Салжаніцын.

Не пачулі.

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ




*«Сягоння» і заўсёды. Пустая афіша ля сельскага кінатэатра. Гродзенская вобласць. Кастрычнік 2006 году.*

# Невядомая Беларусь

**26 кастрычніка** 1959 году нарадзіўся паэт Анатоль Сыс. Да яго ў гэты самы дзень у розныя гады пабачылі свет прэзідэнт Францыі Франсуа Мітэран, які кіраваў сваёй краінай два тэрміны па 7 гадоў, амерыканская кангрэсменка Хілары Клінтан, жонка экс-прэзідэнта ЗША, і апошняя з роду Яноўскіх – Надзея, лёс якой – у цэнтры аповесці Ул.Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”.

**27 кастрычніка** 1989 году на вайсковай базе пад Станькавам на Койданаўшчыне, згодна з савецка-амерыканскай дамовай пра ліквідацыю ракет сярэдняй і меншай дальнасці, знішчана была апошняя ракета СС-23. З гэтага моманту Беларусь стала бяз’ядзернай краінай.

**28 кастрычніка** 1523 году ў Кракаве выйшла з друку паэма Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра” – хрэстаматыйны твор беларускае літаратуры Сярэднявечча.

**29 кастрычніка** – самы чорны дзень у гісторыі беларускай літаратуры. За адну ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 году ў Мінску карнікі НКВД расстралялі цэлую групу пісьменнікаў, сярод якіх былі Анатоль Вольны, Платон Галавач, Алесь Дудар, Міхась Зарэцкі, Валеры Маракоў, Міхась Чарот ды іншыя.

**30 кастрычніка** 1937 году ў Мінску НКВД працягвала расстрэлы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Гэтым разам былі забітыя Янка Нёманскі, Тодар Кляшторны і Юлі Таўбін.

**31 кастрычніка** 1905 году ў Мінску адбылася трагедыя, што ўвайшла ў падручнікі пад назваю “Курлоўскі расстрэл”. Каля вакзала — цяпер цэнтральнага чыгуначнага, а тады ён называўся Віленскім — сабраўся 20-тысячны мітынг мінчукоў, якія выступалі супраць манархіі, за дэмакратычную рэспубліку. На загад губернатара Курлова супраць дэманстрантаў былі кінутыя паліцыя і войска. Пачалася страляніна, у выніку якой 100 чалавек былі забітыя і каля 300 параненыя.




www.belzhaba.com

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

# VILNIA.COM

**ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *“АРХІЎ”* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF;**

**ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

## “СВАБОДА” БУДЗЕ ЗА НАМІ!

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў